# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:908(476)]:[069.1:001.895]

*І. І. Бамбешка*

## Інавацыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці ў практыцы рэгіянальных краязнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь

*Змены ў сацыякультурнай, палітычнай і эканамічнай сітуацыі Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст., укараненне новай адукацыйнай парадыгмы і пашырэнне ў беларускім музейным асяроддзі ўяўленняў пра музей як камунікацыйную сістэму далі жыццё наватарскім формам культурна-адукацыйнай дзейнасці. Разглядаецца, як рэгіянальнымі музеямі асвойваюцца музейна-педагагічныя праграмы, заняткі-гульні, музейныя святы, майстар-класы і інш. На падставе практычнага вопыту краязнаўчых музеяў Беларусі даецца характарыстыка інавацыйных форм, робіцца спроба іх класіфікацыі, выяўляюцца магчымасці для актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.*

Працэсы трансфармацыі светапогляду і светаўспрымання людзей, пераацэнкі каштоўнасцей, абумоўленыя зменамі ў палітычным жыцці беларускага грамадства ў 1990-х гг., не маглі не адбіцца на сацыяльным становішчы, функцыях і змесце дзейнасці рэгіянальных краязнаўчых музеяў. Сучасны краязнаўчы музей імкнецца пашыраць кірункі дзейнасці ў межах сваіх функцый, актыўна рэагаваць на запатрабаванні грамадства з мэтай захавання статусу інстытута фарміравання гістарычнай памяці і забеспячэння пераемнасці культурна-гістарычнага развіцця, транслятара ведаў, каштоўнасцей і культурных сэнсаў, закладзеных у музейных прадметах.

На мяжы XX–XXI стст. пранікненне ў беларускую музейную сферу тэорыі камунікацыі прывяло да паступовага адыходу ад інфарматыўнай мадэлі ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, увасобленай у паняццях «ідэйна-выхаваўчая дзейнасць», «навукова-асветніцкая дзейнасць», на карысць камунікатыўнай. Камунікатыўны падыход прыўнёс пэўную навізну ва ўзаемаадносіны музея з яго аўдыторыяй: наведвальнікі сталі раўнапраўнымі ўдзельнікамі дыялогу. Змена мадэлі адукацыйнай дзейнасці музея стымулявала і з’яўленне новых тэрмінаў – «музейная педагогіка» і «культурна-адукацыйная дзейнасць». Яны з’яўляюцца адлюстраваннем сэнсу выхаваўчага працэсу – адукацыя ў сферы культуры і адукацыя сродкамі культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уключэнне музея ў сферу адукацыі стварыла ўмовы да «пераходу ад ідэі адукаванага чалавека – да ідэі чалавека культуры» [5, с. 281]. У кантэксце сучаснай адукацыйнай парадыгмы мэтай выхаваўчага працэсу прызнаецца фарміраванне падчас міжсуб'ектнага дыялогу творча развітой асобы, якая здольна свядома ўспрымаць каштоўнасны патэнцыял іншых культур, не адмаўляючыся ад уласных меркаванняў і поглядаў. Менавіта ў часавым прадметна-пасторавым асяроддзі музея здзяйсняецца трансляцыя духоўнага, культурнага вопыту, назапашанага чалавецтвам за многія стагоддзі свайго існавання.

Такім чынам, сучаснае ўсведамленне ролі музея ў сацыякультурнай прасторы звязана з пашырэннем і паглыбленнем яго адукацыйнай і рэкрэацыйнай функцый і праявілася ў развіцці наватарскіх форм адукацыйна-выхаваўчага характару. Інавацыйнымі можна лічыць формы, якія запазычаны з іншых сфер культуры, адукацыі і навукі ці абумоўленыя развіццём новых тэхналогій музейнай дзейнасці, якія існуюць адносна нядаўна (не больш 40 гадоў) і яшчэ не атрымалі шырокай распаўсюджанасці ў музеях.

Пытанні культурна-адукацыйнай дзейнасці музея знайшлі адлюстраванне ў навуковых выданнях М. Ю. Юхневіч, Б. А. Сталярова, М. Г. Хугаевай, Л. М. Шляхцінай, Т. В. Галкінай, В. А. Бацяковай, Н. Г. Красуцкай, І. Г. Лупашка, В. У. Мірончык[1] і інш.

Краязнаўчыя музеі складаюць значны сегмент музейнага асяроддзя краіны (больш за 50 % ад агульнай колькасці музеяў краіны). Пытанні функцыянавання і развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці ў сучасных сацыякультурных рэаліях не дастаткова вывучаныя, але надзвычай актуальныя.

[1] *Юхневич М. Ю.* Я поведу тебя в музей : учеб. пособие. – М., 2001. – 137 с.; *Столяров Б. А.* Музей в пространстве художественной культуры и образования : учеб. пособие. – СПб., 2007. – 339 с.; *Хугаева М. Г.* Культурно-образовательная деятельность музея: проблемы формы и содержания // Труды Гос. музея истории Санкт-Петербурга. Музейная педагогика в современной музейной коммуникации. – Вып. 19. – СПб., 2008. – С. 26; *Шляхтина Л. М.* Рекреационно-образовательная миссия современного музея: образование или развлечение? // Вопросы музеологии. – 2013. – № 2 (8). – С. 206–212; *Галкина Т. В.* Основы классификации музейно-педагогических форм в российских музеях // Вопросы музеологии. – 2010. – № 1. – С. 145–153; *Ее же.* О развитии досуговых форм музейно-педагогической деятельности в современных российских музеях // Вестн. Томск. гос. пед. ун-та. – 2012. – № 3 (118). – С. 221–226; *Ботякова О. А.* Музей этнографического профиля в контексте образования и культуры России : автореф. дис. ... канд. культурологии : 24.00.03. – СПб., 2006. – 30 с.; *Мірончык В.* Культурна-асветніцкая работа сучаснага музея // Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі. – Мінск, 1997. – 70 с.; *Яе ж.* Формы работы з наведвальнікам // Музей і наведвальнік. – Мінск, 1999. – С. 20–26; *Лупашка І. Г.* Музейна-педагагічныя заняткі як адна з формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў (у ракурсе сусветных тэндэнцый) // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 13–14 лістап. 2008 г. – Мінск, 2010. – С 131–135; *Красуцкая Н. Г., Кабуткіна В. П.* Музейнае свята: сутнасць, падрыхтоўка і тэхналогія правядзення // Мастацкая адукацыя і культура. – 2005. – № 2. – С. 61–63.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз культурна-адукацыйнай дзейнасці сучасных рэгіянальных краязнаўчых музеяў дазволіў вылучыць такія распаўсюджаныя інавацыйныя формы, як педагагічныя заняткі, праграмы, разлічаныя на розны ўзрост наведвальнікаў, музейныя святы і інш. Яшчэ ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. педагагічныя заняткі адсутнічалі ў практыцы беларускіх музеяў. У якасці эксперымента Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» праводзіў іх з 1989 г. Папулярная форма музейных заняткаў была прынята Нацыянальным музеем гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальным мастацкім музеем, іншымі цэнтральнымі і рэгіянальнымі краязнаўчымі музеямі краіны. Аднымі з першых увялі ў практыку музейна-педагагічныя заняткі для дзіцячай аўдыторыі Краязнаўчы музей Полацка, Браслаўскае раённае музейнае аб'яднанне, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей (ГДГАМ) і інш. Аналіз музейна-педагагічных заняткаў, што праводзяцца рэгіянальнымі краязнаўчымі музеямі, паказаў, што пералік іх невялікі. Выключэнне складаюць Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава (МАКМ імя Е. Р. Раманава) і ГДГАМ. Так, у МАКМ імя Е. Р. Раманава распрацаваны 59 музейна-педагагічных заняткаў, аб'яднаных у 4 цыклы («Чалавек і прырода», «Чалавек і грамадства», «З гісторыі рэчаў і прадметаў» і «Свет цудоўнага»), для дашкольнікаў і 18 – для малодшых школьнікаў [12; 17]. Тэматыка заняткаў пераважна краязнаўчага характару. У ГДГАМ прапануюцца музейна-педагагічныя заняткі для малодшых школьнікаў (34 пазіцыі) і для навучэнцаў сярэдніх і старшых класаў (12 тэм) [11; 13].

З раённых краязнаўчых музеяў найбольш паказальная дзейнасць Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея. Самым маленькім наведвальнікам прапанаваны 5 тэматычных блокаў: азнаямленчы, этнаграфічны, гістарычны, блок аб народных святах, дасягненні продкаў і выніковы занятак. Асобна распрацаваны цыклы (13 пазіцый) для школьнікаў малодшых і сярэдніх класаў [18]. Высокая навукова-метадычная якасць распрацовак музейных урокаў Браслаўскім гісторыка-краязнаўчым музеем на сёння лічыцца адной з лепшых.

Характарызуючы музейна-педагагічныя заняткі, адзначым, што яны сутнасна адрозніваюцца ад школьных. Па-першае, праводзяцца музейным педагогам (супрацоўнікам), па другое – абавязкова выкарыстоўваецца аўтэнтычны музейны прадмет (з навукова-дапаможнага фонду музея) – сапраўдны сведак даўніны, візуальнае і тактыльнае ўзаемадзеянне з якім набліжае наведвальнікаў да мінулага, зараджае іх эмацыянальна.

Сучасны музей выходзіць за межы культурна-ахоўнага інстытута, а ўсё больш становіцца культуратворным. У музейную практыку ўкараняюцца праграмныя формы работы, якія ўлічваюць спецыфіку музея і ўзроставыя асаблівасці аўдыторыі. Пры падрыхтоўцы музейна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічных праграм спецыялісты спалучаюць розныя формы і тэхналогіі работы з улікам адукацыі, сацыяльнай і тэрытарыяльнай прыналежнасці, узроўню музейнай культуры наведвальніка. Комплексны характар праграм дазваляе ўключаць блокі навучальных курсаў, якія забяспечваюць паэтапнае і паслядоўнае развіццё, выхаванне і навучанне асобы музейнымі сродкамі. Музейна-педагагічныя праграмы арыентаваны на актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны, любові да малой радзімы, патрыятызму і выхаванне культурнай ідэнтычнасці.

У Бабруйскім краязнаўчым музеі з 2014 г. арганізаваны музейныя заняткі па праграме «Дай руку, дружа!», назва якой адсылае да эсэ вядомага беларускага пісьменніка, ураджэнца Бабруйска М. Н. Герчыка. Культурна-адукацыйная праграма ўключае цыклы: беларускі «Нам продкамі мудрасць народа завешчана», яўрэйскі «Счастье родиться в Бобруйске», польскі «Bobrujsk – to królewskie miasto». Праграма рэалізуецца праз відэапрэзентацыі, віктарыны, музейныя анімацыі, гутаркі, інтэрактыўныя заняткі, фальклорна-анімацыйныя праграмы, батлеечныя прадстаўленні, пешаходныя экскурсіі, дэгустацыі і г. д. У 2014/15 навучальным годзе беларускі цыкл праграмы быў апрабаваны з вучнямі 5 «В» класа СШ № 24 г. Бабруйска. У наступным навучальным годзе вучні гэтага ж класа пазнаёміліся з яўрэйскім і польскім кірункамі праграмы. Такія мерапрыемствы, як майстар-клас «Беларуская народная лялька Берагіня», прадстаўленні батлеечнага тэатра, фальклорна-анімацыйныя праграмы «Прыехала каляда на белым кані», «Калі Бабруйск быў каралеўскім», «Благаславі, Божа, вясну прыгукаці» і іншыя найбольш запатрабаваны школьнікамі горада. У 2016 г. да жыццяздольнай, зручнай, кампактнай праграмы супрацоўнікі музея дадалі блок «Дети разных народов», які прысвечаны Міжнароднаму фестывалю народнай творчасці «Венок дружбы», і папоўнілі яе рускім кірункам (разглядаюцца тэмы нашчадкаў А. С. Пушкіна на Бабруйшчыне, Бабруйскай крэпасці і інш.) [19].

У развіцці сацыяльных функцый сучаснага музея можна вызначыць шэраг змен, звязаных з інтэграцыяй дзейнасці музея з іншымі ўстановамі культуры. Напрыклад, музейнае свята як комплексная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці аб'ядноўвае элементы экскурсіі, тэматычнага вечара, тэатралізаванага прадстаўлення і інш. Яно праводзіцца спецыялістамі на аснове распрацаванага сцэнарыя пры ўдзеле работнікаў тэатра, музычных устаноў, мастацкай самадзейнасці і інш.

Укараненне музейнага свята ў сферу музейнай дзейнасці ў Расіі адносяць да 1980-х гг. У Беларусі гэта інавацыйная форма з'явілася пазней. Аднак папярэднічалі гэтай з'яве ўстаноўленыя ў 1950-х гг. рытуалы: прыём у піянеры і камсамол, уручэнне пашпартоў, прысвячэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не ў працоўныя і студэнты. Яны праходзілі таксама ў залах музеяў і суправаджаліся часам ганаровым вынасам рэліквій[2]. На сённяшні час характар урачыстасцей змяніўся. Адмаўленне ад афіцыёзу і прызнанне значэння не толькі баявых і працоўных, але і іншых традыцый прывялі да ўзбагачэння тэматыкі і зместу мерапрыемстваў, якія набылі характар свята. Сярод музейных свят вылучаюцца фальклорныя, каляндарныя, літаратурныя, ваенна-гістарычныя, святы рамёстваў, мастацтваў і інш. Адметнасць музейных свят у тым, што яны звязаны з гісторыяй краіны, біяграфіяй працоўных калектываў (або асобнага чалавека), з культурнай спадчынай народа. Практычна музеі адыгрываюць ролю захавальнікаў народных абрадаў і рытуалаў, традыцыйнага мастацтва і іншага, што з часам можа быць уключана ў гісторыка-культурную спадчыну.

Святы ў музеях адрозніваюцца не толькі тэматыкай, але і метадамі іх арганізацыі. Падобным дзействам уласціва агульнасць і навізна, якая праяўляецца ў нефармальнай атмасферы святочнасці (што адрознівае іх ад папярэдніх цырымоній), у эфекце асабістага далучэння, які ствараецца за кошт тэатралізацыі, гульні, непасрэдных стасункаў з «персанажамі» святочнага дзейства, ужывання асаблівай атрыбутыкі. Незвычайнасць свята яшчэ і ў тым, што яно нібы рассоўвае межы музея: музейнае значэнне набываюць духоўныя традыцыі народа, майстэрства, абрады і рытуалы, нацыянальнае мастацтва. Свята садзейнічае іх захаванню і адраджэнню, сам факт яго правядзення ўяўляе сабой спробу вярнуць да жыцця традыцыйную форму адпачынку чалавека. І ў гэтым, відаць, самая вялікая прыцягальнасць музейнага свята для людзей, якія спрабуюць вярнуць страчаныя традыцыйныя ўрачыстасці – без дэманстрацый і трыбун, тэлевізара і застолля і інш. Іншымі словамі, музейныя святы садзейнічаюць адраджэнню форм бытавання аўтэнтычнай культурнай спадчыны.

Дзякуючы святочным мерапрыемствам музей выходзіць за межы экспазіцыйных залаў, уласнага будынка. Форма работы сучасных музеяў «open air» (на адкрытых пляцоўках) прыцягвае вялікую колькасць людзей, якія таксама могуць стаць удзельнікамі свята (для мясцовых жыхароў знаёмая, звыклая экспазіцыя «свайго» музея падчас удзелу ў свяце ўспрымаецца на новым эмацыянальна-псіхалагічным узроўні).

Паспяховасць музейнага свята залежыць ад актывізацыі аўдыторыі, ад умення арганізатараў разбурыць межы паміж глядзельнай залай і сцэнай. Найбольш арганічна праходзяць дзіцячыя святы.

Яркім прыкладам культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў у форме «open air» з'яўляюцца фальклорныя і каляндарныя святы, якія ў апошнія дзесяцігоддзі шырока распаўсюдзіліся ў рэгіянальных краязнаўчых му-

[2] Гэты варыянт музейнага свята захаваўся ў рэпертуары асобных краязнаўчых музеяў Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зеях рэспублікі. Музеі сумесна з наведвальнікамі адзначаюць Каляды, Грамніцы, Зялёныя святкі (Тройца), Гуканне вясны, Купалле і інш.

Традыцыйным для краязнаўчых музеяў стала арганізацыя вяселля, якое таксама можна разглядаць як варыянт музейнага свята. У час правядзення вясельнага абраду адбываецца актуалізацыя шырокага спектра культурнай спадчыны. Адным з першых рэалізаваў вясельны праект «Горка па-беларуску» ў 2008 г. Вілейскі краязнаўчы музей. Гэты абрадавы праект стаў вынікам сур'ёзнага навукова-этнаграфічнага даследавання, якое было праведзена сябрамі студыі вілейскіх народных абрадаў і традыцый «Краявід». Студыя сумесна з супрацоўнікамі музея ў час экспедыцыі на Вілейшчыну запісалі абрад народнага вяселля «Вянок», падрабязна ахарактарызавалі яго значныя этапы, зафіксавалі ўспаміны аб правядзенні абраду, сабралі вясельныя прадметы (адзенне, музычныя інструменты, папяровыя кветкі для вяночка маладой, шаргуны для коней і інш.), а таксама фотаздымкі вяселляў канца XIX–XX ст. Акрамя таго, даследчыкі звярнуліся і да прац навукоўцаў, якія ў розныя часы збіралі інфармацыю аб традыцыйнай культуры Вілейшчыны. На падставе багатага матэрыялу быў складзены сцэнарый абраду вілейскага народнага вяселля «Горка па-беларуску». У абрадзе ўдзельнічаюць не толькі маладыя, але і ўсе госці на вяселлі. Кожны момант вяселля – гэта вернутыя да жыцця абрады і традыцыі, што бытавалі на Вілейшчыне. Сёння музей прадстаўляе паслугу «Новай сям'і – уласны герб» для тых, хто жадае далучыцца да магнацкіх традыцый. У час вясельнага абраду маладыя атрымліваюць родавы герб, які ствараецца для іх супрацоўнікамі музея, і Грамату, якая будзе пацвярджаць прыналежнасць роду да ўласнага герба, а прозвішча новай сям'і заносіцца ў Кнігу магнацкіх гербаў Вілейшчыны [2].

Да інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў адносяцца гістарычныя рэканструкцыі і фестывалі. Напрыклад, шырокую вядомасць набылі фестывалі лапікавага шыцця «Здраўнёўская палітра» (праводзіць Віцебскі абласны краязнаўчы музей на базе ўласнага філіяла «Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна "Здраўнёва"»); рыцарскі «Меч Брачыслава» (арганізаваны Браслаўскім раённым аб'яднаннем музеяў у рамках міжнароднага свята традыцыйнай беларускай культуры «Браслаўскія зарніцы»); ваенна-гістарычны фестываль-рэканструкцыя «Выганашчанская фартэцыя» (праводзіцца Івацэвіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеем), якія прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны, і інш. [4, с. 29; 9, с. 25; 16, с. 10].

Актуалізацыя індывідуальна-псіхалагічных задач гістарычнай навукі, антрапалагічнага падыходу цесна звязана са з'яўленнем у практыцы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў такіх музейных свят, як Дзень нараджэння ў музеі, акцыі, прысвечаныя Міжнароднаму дню студэнтаў, дню ўсіх закаханых (14 лютага) і інш. [3, с. 29].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш яркім прыкладам музейнага свята з’яўляецца «Ноч музеяў» – міжнародная акцыя, якая праводзіцца з мэтай паказаць магчымасці і патэнцыял сучасных музеяў, пашырыць кола наведвальнікаў. «Ноч музеяў» праходзіць пад эгідай Савета Еўропы і падтрымліваецца Міжнародным саветам музеяў (ІКОМ), яна прымеркавана да штогадовага святкавання Міжнароднага дня музеяў – 18 мая.

Першая ноч музеяў, якая ўвайшла ў гісторыю як «Доўгая ноч музеяў» (Lange Nachtder Museen), адбылася ў Берліне ў 1997 г. У гэты дзень наведвальнікаў прапускалі ў музеі бясплатна, а экскурсіі праводзіліся на працягу ўсёй ночы. Ідэя атрымала вялікі поспех, і на наступны год да акцыі далучыліся іншыя гарады Германіі. У 1999 г. па ініцыятыве Міністэрства культуры і камунікацыі акцыя пад назвай «Вясна музеяў» распаўсюдзілася ў Францыі. Дзякуючы вялікай папулярнасці мерапрыемства з 2005 г. яно было прызнана агульнаеўрапейскім і атрымала назву «Ноч музеяў». Музеі, прытрымліваючыся абранай тэматыкі, арганізоўвалі выстаўкі, ярмаркі, тэатралізаваныя прадстаўленні, перформансы, маскарады і канцэрты [14].

У Беларусі «Ноч музеяў» стартавала ў 2005 г., калі ўдзел у акцыі прынялі ўсяго 3 музеі: Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўны музей тэатральнай і музычнай культуры. Мерапрыемства прыйшлося даспадобы музеям, наведвальнікам, таму было замацавана ў нацыянальным культурным календары. З 2018 г. павялічылася колькасць музеяў, якія далучыліся да акцыі, мяняецца тэматыка, змест і насычанасць святочных сустрэч.

Тым не менш, аналізуючы праграмы акцыі «Ноч музеяў» рэгіянальных краязнаўчых музеяў, можна адзначыць шэраг асаблівасцей. Па-першае, яна пераважна праводзіцца ў сярэдзіне дня, па-другое, прадстаўляецца адной падзеяй (напрыклад, адкрыццём выстаўкі ці прэзентацыяй), па-трэцяе, асобныя музеі некалькі год запар эксплуатуюць адну тэму (напрыклад, Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей на працягу 2 гадоў праводзіў святочныя мерапрыемствы пад адной назвай «Троіцкія (зялёныя) святкі», а Віцебскі раённы краязнаўчы музей арганізоўвае музейна-педагагічныя заняткі ці прэзентацыю пад назвай «Музеі свету»).

У перыядычным друку, інтэрнэт-рэсурсах прыводзяцца і іншыя прыклады. Так, у 2013 г. Бягомльскі музей народнай славы «Ноч музеяў» правёў пад назвай «Бягомльскія авіялініі: па краінах і кантынентах». Праграма была насычана рознымі падзеямі на працягу дня [15]. У Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі ў межах той жа акцыі ладзяцца святы пад агульнай назвай «Этнаграфічны марафон» [7]. Цікава, што многім музеям даспадобы тэматыка ў стылі рэтра. Менавіта такой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была «Ноч музеяў 2012» у Бягомльскім, Гарадоцкім і Лепельскім музеях: мерапрыемствы ў рэтрастылі прыцягнулі ўвагу людзей сталага ўзросту [10].

Што датычыць станоўчага боку святкавання «Ночы музеяў» у апошняе дзесяцігоддзе, рэгіянальнымі краязнаўчымі музеямі наладжваюцца маштабныя святы, дзе гледачам, акрамя наведвання выставачных залаў, прапаноўваюцца тэатралізаваныя гістарычныя імпрэзы, вогненнае шоу, флэшмобы, выступленне рэгіянальных і рэспубліканскіх эстрадных зорак у атачэнні высокай якасці гуку і святла. Правядзенне такіх акцый сведчыць аб выкарыстанні музеямі сваіх магчымасцей, пашырэнні дыяпазону музейнага ўплыву, аб далучэнні беларускіх музеяў да еўрапейскіх традыцый.

Цікавай інавацыйнай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці з'яўляецца майстар-клас. Майстар-клас як форма ўзаемадзеяння накіраваны на вырашэнне цэлага спектра задач, звязаных з атрыманнем і абменам прафесійным вопытам, данясеннем да наведвальнікаў метадычна выверанай інфармацыі, практычных напрацовак з рэкамендацыямі самога майстра і вывучэннем яго прафесійнага майстэрства.

Правядзенне майстар-класаў у музеі дазваляе задзейнічаць аўтэнтычныя музейныя прадметы. Зацікаўленасць у майстар-класах адзначаецца ў розных сацыяльных і ўзроставых групах – гэта вучні мастацкіх школ і студый, метадысты адукацыйных устаноў, выкладчыкі выяўленчага мастацтва агульнаадукацыйных і спецыялізаваных устаноў, студэнты і выкладчыкі адпаведных навучальных устаноў.

У краязнаўчых музеях рэспублікі праводзяцца майстар-класы па саломапляценні, выцінанцы, валянні з воўны, стварэнні аўтарскіх і народных лялек, роспісе навагодніх цацак і велікодных яек і інш. У Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі ідэю майстар-класаў ацанілі станоўча. У 1990 г. у музеі працавалі дзве залы экспазіцыі, аб'яднаныя назвай «Лён і народнае ткацтва», дзе былі прадстаўлены ўсе прылады для апрацоўкі лёну і воўны, паказаны ўзоры мясцовага тэкстылю, а таксама ўнікальная калекцыя падвойных дываноў (самы ранні датуецца 1898 г.). Дзякуючы мясцоваму народнаму майстру В. І. Белакоз гэта тэхніка была адроджана і ў 2011 г. унесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [6]. З мэтай актуалізацыі тэхнік вырабу дываноў пры музеі быў арганізаваны ткацкі гурток для навучэнцаў мясцовай школы. У 2002 г. адчынілася зала «Практычнага ткацтва» з трыма дзеючымі вялікімі кроснамі, на якіх супрацоўніцы музея ткуць прыгожыя падвойныя дываны, посцілкі, абрусы, ручнікі, сурвэткі. Для ўсіх зацікаўленых у музеі на аснове адроджаных традыцый праводзяцца майстар-класы па навучанні ткацкаму рамяству як на вялікіх кроснах, дзе ствараюцца дываны, так і на маленькіх ручных, на якіх вырабляюцца закладкі, паяскі, гальштукі [8, с. 33]. Варта адзначыць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з 2016 г. супрацоўнікі музея і майстры народнага ткацтва штогод праводзяць летнюю школу «Майстэрня падвойнага ткацтва».

Такім чынам, майстар-класы ўяўляюць сабой як самастойную форму, так і частку комплекснай (напрыклад, музейнае свята).

Музейная гульня – новая форма камунікатыўнай мадэлі. Яна спалучае ў сабе магчымасці дыялогу, інтэрактыўнасці і ўласна гульнявыя прыёмы, дазваляе наведвальніку зрабіць экскурсію ў музей яркай падзеяй.

У замежных краінах гэтая форма музейнага адпачынку папулярная з 1970-х гг. У Беларусі яна распаўсюдзілася пазней. Даследчыкі разглядаюць музейную гульню як сінтэз прадметнага асяроддзя і ролевага кампанента ў музейнай (пазамузейнай) прасторы. Адначасова музейная гульня з'яўляецца спосабам актывізацыі аўдыторыі з дапамогай гульнявых методык і прыёмаў з мэтай павышэння эфектыўнасці ўспрымання гісторыка-культурнай спадчыны, засваення адпаведнага вопыту і сістэмы норм, каштоўнасцей мінулага. Асаблівасць музейнай гульні ў тым, што яна цалкам пабудавана на ролевых паводзінах удзельнікаў і дае магчымасць паглыбіцца ў мінулае, назапашваць вопыт непасрэднага дакранання да гісторыі. Гэтая адметнасць музейнай гульні служыць падставай для вылучэння яе ў якасці самастойнай і перспектыўнай формы. Рэалізаваць яе музеі змогуць, калі будуць мець спецыяльную прастору, атрыбуты (уключаючы касцюмы), добра падрыхтаванага кіраўніка з акцёрскімі здольнасцямі, а таксама жаданне аўдыторыі ўключыцца ў гульню, прыняць яе ўмовы.

Па ўзроставым складзе аўдыторыі музейныя гульні бываюць дзіцячыя, маладзёжныя і сямейныя. Варыянтаў гульні ў музеі ці з музейнымі прадметамі, пабудаванай на аснове ролевых паводзін, мноства: ад спробы імітацыі жэста ці мімікі чалавека, адлюстраванага на карціне, да калектыўных гульнявых заданняў, якія маюць дачыненне да гістарычных падзей. Дадзены метад прадугледжвае стварэнне сітуацый, якія мадэлююць рэальнасць і падчас якіх удзельнікі вучацца аперыраваць ведамі, змяняць свае ўяўленні ў адпаведнасці з новымі акалічнасцямі, што выклікае актывізацыю творчай дзейнасці. Музейная гульня можа выступаць як гульня-вандраванне, гульня-даследаванне, гістарычная ролевая гульня і інш. Гульні носяць характар геаграфічных, гістарычных, краязнаўчых, даследчых экспедыцый, якія здзяйсняюцца на экспазіцыі, могуць выходзіць за межы музея, і ў час якіх удзельнікі выконваюць пэўныя заданні, запаўняюць спецыяльныя дзённікі, музейныя сшыткі ці апытальнікі. У якасці заахвочвання пераможцаў – прыз.

Адной з найбольш запатрабаваных і распаўсюджаных у практыцы айчынных рэгіянальных краязнаўчых музеяў форм пазнавальнай гульні з'яўляецца музейны квэст. Тэрмін «квэст» (англ. quest азначае пошук, шукаць, адшуканы прадмет) узнік у сферы камп'ютарных гульняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у 1980-я гг., а з 2007 г. шырока распаўсюдзіўся. Сённяшнія гарадскія квэсты праводзяцца на вуліцах, у парках, бібліятэках і музеях.

Як і майстар-класы, музейныя гульні (квэст-гульні) могуць праводзіцца як разавыя тэматычныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да нейкай падзеі, ці з'яўляцца часткай комплекснай формы. Напрыклад, Брэсцкі абласны краязнаўчы музей распрацаваў шэраг музейных квэстаў на базе ўласных філіялаў «Археалагічны музей "Бярэсце"» і «Камянецкая вежа» і інш. [11].

Падводзячы вынік, адзначым, што на мяжы XX–XXI стст. у практыку айчынных рэгіянальных краязнаўчых музеяў пачалі ўкараняцца інавацыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці. Іх з'яўленне і пашырэнне было абумоўлена шэрагам фактараў: істотныя змены ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці краіны; пагаршэнне эканамічнай сітуацыі; зніжэнне аб'ёмаў дзяржаўнага фінансавання; змяншэнне колькасці наведвальнікаў і інш.

Тым не менш на фоне сацыякультурнай дэструкцыі назіралася ўзрастанне цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны з боку мясцовага насельніцтва. Фарміравалася новая адукацыйная парадыгма, сутнасць якой – у спалучэнні рацыянальнага і каштоўнаснага аспектаў у адзіным педагагічным працэсе, арыентацыя адукацыі на самарэалізацыю індывіда і выхаванне творча развітой асобы.

Пранікненне (праўда, са значным спазненнем) у айчынную музейную тэорыю і практыку камунікатыўных уяўленняў стымулявала пашырэнне і паглыбленне напрамкаў і форм работы краязнаўчых музеяў у межах сваіх сацыяльных функцый (перш за ўсё функцыі адукацыі і выхавання і арганізацыі вольнага часу).

Вывучэнне інтэрнэт-рэсурсаў краязнаўчых музеяў краіны, іх публікацый у навуковых выданнях, артыкулаў у перыядычным друку дазволіла выявіць наступныя інавацыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці: музейна-педагагічныя заняткі, праграмы, музейныя святы, майстар-класы і гульні. Падчас іх правядзення ствараецца атмасфера святочнасці, выкарыстоўваюцца музейныя прадметы, захоўваецца азнаямленне са звычаямі і традыцыямі беларусаў, абуджаецца цікавасць грамадства да гісторыі і культуры свайго краю.

Неабходнасць фарміравання прывабнага вобраза музея, пашырэння музейнай аўдыторыі, улік аб'ектыўных патрабаванняў людзей у свой вольны час спалучаць пазнанне з адпачынкам вымушае краязнаўчыя музеі выкарыстоўваць відовішчна-гульнявыя формы арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці (фестывалі, рэканструкцыі), уключаюць наведвальніка ў працэс актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

*1.* Абанементы для вучняў 5–9 класаў [Электронны рэсурс] // Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Музейно-образовательные программы для средней школы. – Рэжым доступу: https://museum-grodno.by/ru/shkolam/obrazovatelnye-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

programmy/muzejno-obrazovatelnye-programmy-dlya-srednej-i-starshej-shkoly-na-2017-2018-uchebnyj-god/. – Дата доступу: 05.01.2019 г.

*2.* Абрад традыцыйнага беларускага вяселля [Электронны рэсурс] // Вілейскі краязнаўчы музей. Абрадавыя мерапрыемствы. – Рэжым доступу: http://vilmuseum.by/services/events/. – Дата доступу: 25.09.2013.

*3.* Беларуская культуры сёння : гадавы агляд, 2009 / А. М. Бязуглы [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2010. – 148 с.

*4.* Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. – 143 с.

*5. Библер, В. С.* От наукоучения – к логике культуры: Два философских введения в двадцать первый век / В. С. Библер. – М. : Политиздат, 1990. – 413 с.

*6.* Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] // М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://www.kultura.by/uploads/files/Gosspisok-sajt-2018-10.05.2018.pdf. – Дата доступу: 08.01.2019.

*7.* Зводная праграма мерапрыемстваў да Міжнароднага дня музеяў і ў рамках акцыі «Ноч музеяў» 2013 [Электронны рэсурс] // М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://www.kultura.gov.by/news/zvodnaya-pragrama-merapryemstva-da-m-zhnarodnaga-dnya-muzeya-ramkakh-aktsy-noch-muzeya-2013. – Дата доступу: 10.10.2013.

*8. Еўдакіменка, С.* З вопыту захавання і вывучэння традыцыйнай тэхналогіі падвойнага ткацтва / С. Еўдакіменка // Музей і традыцыйная культура Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Гомель, 17–18 мая 2011 г. / рэдкал.: С. В. Разанаў (гал. рэд.), В. В. Дамасканаў, С. К. Канановіч. – Гомель, 2011. – С. 34–37.

*9. Ісачанка, А. Л.* Абагульненне вопыту работы з наведвальнікамі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі / А. Л. Ісачанка // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 24 лістап. 2011 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 55–60.

*10.* Міжнародны дзень музеяў 2012 [Электронны рэсурс] // М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://www.kultura.by/news/m-zhnarodny-dzen-muzeya-2012. – Дата доступу: 10.10.2013.

*11. Митюков, А. В.* Новые формы и методы культурно-образовательной деятельности УК «Брестский областной краеведческий музей» / А. В. Митюков // Актуальные проблемы идеологического обеспечения деятельности органов власти : информ. бюллетень. – 2016. – № 2. – С. 25–28.

*12.* Музейныя заняткі для школьнікаў малодшых класаў [Электронны рэсурс] // Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава. – Рэжым доступу: http://mogilewmuseum.by/muzeinyya-zanyatki/dashkolnyya-stanovy. – Дата доступу: 05.01.2019.

*13.* Музейныя праграмы для пачатковай школы [Электронны рэсурс] // Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. – Рэжым доступу: https://museum-grodno.by/ru/shkolam/obrazovatelnye-programmy/muzejno-obrazovatelnye-programmy-dlya-nachalnoj-shkoly-na-2017-2018-uchebnyj-god/. – Дата доступу: 05.01.2019.

*14.* Ночь музеев в Беларуси [Электронный ресурс] // Ночь музеев. – Режим доступа: http://nochmuzeev.by/ob-aktsii/. – Дата доступа: 14.01.2019.

*15.* Ноч у музеі «Бягомльскія авіялініі» [Электронны рэсурс] // Бягомльскі музей народнай славы. – Рэжым доступу: http://vitebsk-region.museum.by/node/33821. – Дата доступу: 20.09.2013 г.

*16. Рагін, Я.* Тут быў гатэль Базансона… / Я. Рагін, К. Антановіч // Культура. – 2016. – 30 крас. – С. 10–11.

*17.* Тэмы музейных заняткаў для дашкольных устаноў [Электронны рэсурс] // Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава. – Рэжым доступу: http://mogilewmuseum.by/muzeinyya-zanyatki/dashkolnyya-stanovy. – Дата доступу: 05.01.2019.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18.* Услуги Браславского историко-краеведческого музея [Электронный ресурс] // Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў. – Режим доступа: http://braslav.museum.by/node/35386. – Дата доступа: 22.09.2018 г.

*19. Цімашэнка, Л.* З шырока адчыненымі дзвярыма, або Чым жыве краязнаўчы музей у Год культуры [Электронны рэсурс] / Л. Цімашэнка // Вечерний Бобруйск. – Рэжым доступу: https://bobruisk.ru/news/2016/05/18/z-shyroka-adchynenymi-dzvyarami-abo-chym-zhyve-krayazna-chy-muzej-u-god-kul-tury. – Дата доступу: 08.01.2019 г.

*I. Bambeshka*

**Innovative forms of cultural and educational activity in the practice of regional local history museums of the Republic of Belarus**

*Changes in the sociocultural, political and economic situation of the Republic of Belarus in the late twentieth and early twenty-first centuries, the adoption of a new educational paradigm and the expansion of the ideas about the museum as a communicative system in the Belarusian museum environment gave birth to the innovative forms of cultural and educational activity. Thus, museum and pedagogical programmes, lessons-games, museum holidays, and workshops appeared in the practice of the Belarusian regional local history museums. On the basis of practical experience of local history museums of Belarus, the description of the innovative forms is given, the attempt to classify them is made, and opportunities for actualization of historical and cultural heritage are identified.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.03.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ